Установа адукацыі
«Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна»
Кафедра спартыўных дысцыплінаў і методык іх выкладання

**Ул.П.Люкевіч**

# АНТЫДОПІНГАВАЯ ПАЛІТЫКА Ў СУЧАСНЫМ СПОРЦЕ

**Электронны вучэбна-метадычны комплекс**

Брэст
БрДзУ імя А.С. Пушкіна
2022

УДК 796.06:615.2-056.157(075.8)
ББК 75.091я73
Л94

*Рэкамендавана рэдакцыйна-выдавецкім саветам установы адукацыі «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна»*

*Аўтар-складальнік:*
дацэн кафедры спартыўных дысцыплінаў і методык іх выкладання
УА «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна»
**Ул.П.Люкевіч**

*Рэцэнзенты:*

кафедра фізічнага выхавання і спорта
УА «Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт»

загадчык кафедры лёгкай атлетыкі, плавання і лыжнага спорту
УА «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна»
кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**А.В.Шароў**

**Люкевіч, Ул.П.** Антыдопінгавая палітыка ў сучасным спорце : электронны вучэбна-метадычны комплекс / Ул.П.Люкевіч ; Брэсц. дзярж. ун-т імя А.С. Пушкіна. – Брэст : БрДУ, 2022. – 29 с.

У электронным вучэбна-метадычным комплексе прадстаўлены навучальны матэрыял па вучэбнай дысцыпліне “Антыдопінгавая палітыка ў сучасным спорце”.

ЭВМК уключае актуалізацыю дадзенай тэматыкі, змест вучэбнага матэрыялу, прыкладны тэматычны план, падставовыя заліковыя патрабаванні, спісы асноўнай і дадатковай літаратуры, пералік пытанняў для самаправеркі і кантрою ведаў.

Выданне прызначанае для магістрантаў факультэта фізічнага выхавання і турызму спецыяльнасці 1-08 80 04 “Фізічная культура і спорт”.

УДК 796.06:615.2-056.157(075.8)
ББК 75.091я73

# ЗМЕСТ

Тлумачальная запіска . . . . . 4
Змест вучэбнага матэрыялу . . . . . 9
Прыкладны тэматычны план . . . . . 13
Вучэбна-метадычная карта навучальнай дысцыпліны . . . . . 14
Інфармацыйна-метадычная частка . . . . . 18
Пытанні для самаправеркі і кантролю ведаў . . . . . 23
Пералік пытанняў для самастойнай работы . . . . . 27
Крытэрыі ацэнкі ведаў студэнтаў . . . . . 29

## Тлумачальная запіска

Вучэбная дысцыпліна “Антыдопінгавая палітыка ў сучасным спорце” распрацавана ў адпаведнасці з патрабаваннямі да падрыхтоўкі магістрантаў па спецыяльнасці 1-08 80 04 “Фізічная культура і спорт” і вывучаецца магістрантамі факультэта фізічнага выхавання на 1 курсе дзённай формы атрымання адукацыі, а таксама на 1 курсе завочнай формы атрымання адукацыі.

Вучэбная дысцыпліна “Антыдопінгавая палітыка ў сучасным спорце” прапануе магістрантам змястоўныя і даступныя для ўспрымання ўводзіны ў такое праблемнае поле прафесійнага спорту, як допінгавае злоўжыванне. Згодна з найважнейшымі дакументамі Міжнароднага алімпійскага камітэту, Сусветнага антыдопінгава агенцтва, а таксама міжнародных федэрацыяў па відах спорту ў дастаткова распрацаваным выглядзе для ўспрымання высвятляюцца галоўныя тэндэнцыі, што звязаныя з узнікненнем, развіццём і распаўсюджваннем допінгу ў сацыякультурнай прасторы чалавечага грамадства.

Фармаванне антыдопінгавай палітыкі ў сучасным спорце базуецца на наступных тэарэтыка-метадалагічных падставах:

- адукацыі, прафілактыцы і правах спартоўцаў, што знаходзяць канцэнтраванае ўвасабленне ў Алімпійскай клятве, якая распаўсюджваецца таксама на ўсіх тых асобаў, якія бяруць удзел у спартыўных спаборніцтвах і абавязаныя выконваць усе тыя правілы, што адпавядаюць прынцыпам Fair Play, у сувязі з чым палітыка WADA уключае ў сябе такія адукацыйныя праграмы, дзе вызначаюцца галоўныя накірункі па барацьбе з допінгам;

- пастулатах Антыдопінгавага кодексу Алімпійскага руху як падставы для барацьбы з допінгам, дзе падаецца ліст забароненых рэчываў, метадаў, што паляпшаюць вынікі спарбоўцаў;

- санкцыях, пад якія трапляе спартовец, які выкарыстоўвае забароненыя допінгавыя рэчывы і метады;

- ажыццяўленні маніторынгавага кантролю ў перыяд паміж спаборніцтвамі (сістэма ADAMS).

У сучасных умовах пошуку новай стратэгіі прагрэсу, засваення новых каштоўнасцяў і ідэалаў у адносінах як да асобнага чалавека, так і да грамадства ў цэлым, вядуцца напрацоўкі такой антыдопінгавай палітыкі ў сучасным спорце, якая б адпавядала далейшаму станаўленню і развіццю дадзенага віду сацыяльнай дзейнасці.

Сучасная сістэма вышэйшай адукацыі на Беларусі павінна рыхтаваць моладзь да адпаведнага ўзору арыентацыі ў цяперашніх сацыякультурных варунках і адначасова да творчай арыентацыі. Гэта, у сваю чаргу, улічвае высокую ступень кампетэнтнасці і наяўнасць глыбокіх ведаў у вобласці антыдопінгавай палітыкі ў сучасным спорце.

Мэтай вучэбнай дысцыпліны з'яўляецца выпрацоўка стратэгіі паводзінаў спецыялістаў у сістэме спартыўнай дзейнасці у вобласці выкарыстання фармакалагічных легальна дазволеных прэпаратаў, якія не ўваходзяць у ліст афіцыйна забароненых сродкаў і метадаў з боку Сусветнага Антыдопінгавага Агенцтва, асэнсаванне найлепшага спосабу зносінаў і кантактаў дзеля дасягнення прафесійных і іншых мэтаў.

Задачамі дадзенай вучэбнай дысцыпліны з'яўляюцца: засваенне ведаў пра асаблівасці і тэндэнцыі развіцця антыдопінгавай палітыкі ў сучасным спортце на Беларусі і на свеце, інстытуты антыдопінгава кантролю, што дзейнічаюць на Беларусі і па-за яе межамі, знаёмства і праца з сучаснымі фармакалагічнымі тэхналогіямі, выпрацоўка навыкаў дзелавога ўзаемадзеяння і стратэгіі прафесійных паводзінаў, стварэнне адпаведнага іміджу, што дазваляе найлепшым чынам вырашаць прафесійныя задачы.

Методыка дадзенай дысцыпліны базуецца на такой сістэме навучання, якая развівае асобу, дазваляе шырока прымяняць праблемныя лекцыі, ствараць гульнявыя сітуацыі, павышаць ступень практычнай значнасці курса.

Метадалагічнае забеспячэнне, успрыманне законаў і заканамернасцяў фармавання антыдопінгавай палітыкі ў сучасным спорце прадстаўляюць этыка, культуралогія і фізіялогія. Курс утрымлівае моцны акцэнт у бок сувязі з практыкай сацыяльнага жыцця, што выказваецца ў тым, наколькі дадзеная тэматыка знаходзіць сваё ўвасабленне ў падзеях свету, краіны і рэгіёна.

Чалавечае развіццё і спорт – гэта працэс пашырэння чалавечых магчымасцяў. Яго перспектывы сфакусаваныя на людзях, што шмат у чым дапамагае ацаніць прагрэс у катэгорыях дасканаласці, што займае важнае месца ў якасці нацыянальнага жыцця. Па сутнасці перспектывы чалавечага развіцця маюць міждысцыплінарны характар, што звязаны з культурнымі, эканамічнымі, палітычнымі, дэмаграфічнымі, гістарычнымі і сацыялагічнымі даследаваннямі.

Згодна з вышэйпазначаным, прапанаваны курс па антыдопінгавай палітыцы ў сучасным спорце дапаможа:

- вызначыць пачаткі каардынатаў у адносінах да маральна-этычных і прававых падставаў сучаснага спорту;

- распрацаваць інтэграваную міждысцыплінарную перспектыву антыдопінгавай адукацыі.

Вучэбная дысцыпліна “Антыдопінгавая палітыка ў сучасным спорце” далучае магістрантаў да адпаведнай інфармацыі па фармаванню перадумоў іх самастойнай навукова-педагагічнай творчасці ў дадзеным накірунку. Навучанне магістрантаў у дачыненні да ўспрымання і асэнсавання чалавечага развіцця арыентавана на адзінства асветы, выхавання і магчымасцяў больш дакладнай арыентацыі ў сацыяльным асяроддзі. Яно прадугледжвае вырашэнне наступных задач:

- асэнсаванне магістрантамі пераемства сувязяў у практыцы чалавечага развіцця, універсальнага значэння агульначалавечых каштоўнасцяў праз раснастайныя сродкі і сістэмы адукацыі;

- разуменне магістрантамі спецыфікі чалавечага развіцця і ролі індывіда ў сістэме спартыўнай дзейнасці;

- фармаванне ў магістрантаў здольнасці да пераносу інфармацыі па чалавечым развіцці на ўзровень асэнсавання асобы;

- усведамленне магістрантамі самакаштоўнасці чалавека не толькі ў сваёй асобе, але і ў асобе іншага;

- фармаванне здольнасці талерантных адносін да іншых людзей.

Па заканчэнні курса магістрант павінен:

a) ведаць:

- асноўныя паняцці і катэгорыі, што адносяцца да праблемы допінга ў сучасным спорце;

- падставовыя прынцыпы фармавання антыдопінгавай палітыкі ў спорце;

b) умець характарызаваць:

- актуальныя праблемы допінга ў сучасным спорце;

c) умець аналізаваць:

- спецыфіку сацыяльных ведаў і яе ролю ў сацыяльным быцці;

- канкрэтныя сітуацыі злаўжывання допінгу ў сучасным спорце;

- асабісты маральны выбар;

d) набыць якасці і навыкі:

- палемікі і дыялогу праз дасведчанне, атрыманае ў разуменні фармавання антыдопінгавай палітыкі ў сучасным спорце;

- даследавання і вырашэння канфліктных сітуацый;

- адэкватнай самаацэнкі і талерантнасці ў адносінах да ншых людзей.

На дзённай форме атрымання адукацыі факультэта фізічнага выхавання па спецыяльнасці "Фізічная культура і спорт" вучэбная дысцыпліна "Антыдопінгавая палітыка ў сучасным спорце" вывучаецца студэнтамі на 1 курсе ў першым семестры, усяго на дысцыпліну адводзіцца 90 гадзінаў, з іх аўдыторныя – 36 гадзінаў: лекцыйныя заняткі – 10 гадзінаў, практычныя заняткі – 20 гадзінаў, самастойная работа пад кіраўніцтвам – 6 гадзінаў. Форма кантроля ведаў – залік у першым семестры.

На завочнай форме атрымання адукацыі факультэта фізічнага выхавання па спецыяльнасці “Фізічная культура і спорт” вучэбная дысцыпліна “Антыдопінгавая палітыка ў сучасным спорце” вывучаецца магістрантамі на 1 курсе ў першым семестры, разам на дысцыпліну адводзіцца 90 гадзінаў, з іх аўдыторныя – 10 гадзінаў: лекцыйныя заняткі – 4 гадзіны, практычныя заняткі – 6 гадзінаў. Форма кантроля ведаў – залік у першым семестры.

У адпаведнасці з патрабаваннямі да структуры тыпавога навучальнага плану па спецыяльнасці “Фізічная культура і спорт” дадзеная праграма ўлічвае неабходныя элементы адукацыйнага стандарту згодна з кампанентамі ўстановы вышэйшай адукацыі.

Міжпрадметныя сувязі вызначаюцца ў найбольшай ступені з сістэмай навуковых ведаў культуралогіі, этыкі і фізіялогіі.

Змест вучэбнага матэрыялу

**Тэма 1. Уводзіны ў праблематыку. Допінг у сучасным спорце.**

Феномен спорту ў сацыякультурнай прасторы сучаснага глабалізаванага грамадства. Класіфікацыя спорту: прафесійны спорт, камерцыйны спорт, аматарскі спорт, спорт для ўсіх. Агульныя падставы фармакалагічнага забеспячэння ў спорце. Паняцце і азначэнне допінгу. “Філасофія” допінгу.

**Тэма 2. Допінгавыя рэчывы і іх уплыў на арганізм атлетаў у выбраных відах спорту.**

Гісторыя ўзнікнення і прымянення допінгу. Характарыстыка допінгавых сродкаў і метадаў, найбольш распаўсюджаныя рэчывы, іх фізіялагічная роля і сфера прымянення: - эрытрапаэцін (ЭПО, CERA), - анабалічныя стэроіды (тэстастэрон, станазалол, нандралол, матаналол), - дыўрэтыкі (хлорталідон, ацэтазаламід, трыамтарын, фурасемід), - пераліванне крыві і яе кампанентаў (гематрансфузія, аўтагематрансфузія), - стымулятары псіхічнай дзейнасці (какаін, эфедрын, экстазі, амфітаміны).

**Тэма 3. Допінг: падставы класіфікацыі забароненых рэчываў.**

Допінгавыя сродкі на падставе прэпаратаў наступных груп: - стымулятары (стымулятары цэнтральнай нярвовай сістэмы, сімпатаміметыкі, анальгетыкі); - наркотыкі (наркатычныя анальгетыкі); - анабалічныя стэроіды; - бетаблакатары; - дыўрэтыкі. Допінгавыя метады: крывяны допінг; - фармакалагічны допінг; - генны допінг.

Класы спалучэнняў абмежаваных814 нават з лячэбнымі мэтамі: - алкаголь; - марыхуана; - сродкі мясцовай анэстазіі; - картыкастэроіды.

**Тэма 4. Допінг-кантроль: методыка правядзення.**

Паняцце і азначэнне допінг-кантролю. Афіцэр допінг-кантролю: яго ідэнтыфікацыя і абавязкі. Станцыя допінг-кантролю і яе апісанне. Парадак адбору спартоўцаў для антыдопінгавага тэставання. Паведамленне аб допінг-кантролю. Выбар ёмістасці для аналізу і здача пробы. Камплект для захавання допінг-пробы і прысваенне нумару. Падзел аналізу на пробы "A" і "B", фармуляр допінгавага кантролю. Паняцце і характарыстыка сістэмы ADAMS (The Anti-Doping Administration & Management System).

**Тэма 5. Працэдура допінг-кантроля: правы і абавязкі спартоўца.**

Антыдопінгавыя правілы і працэдурныя правілы допінг-кантроля. Правы спартоўца пад час працэдуры допінг-кантролю: - наяўнасць прадстаўніка і перакладчыка; - атрыманне дадатковай інфармацыі аб працэдуры адбору; - асабісты ўдзел ва ўсіх этапах працэдуры верыфікацыі пробы; - асабісты кантроль за падрыхтоўкай пробы для транспарціроўкі; - магчымасць афармлення заўвагі пры запаўненні пратаколу допінг-кантролю на роднай мове; - атрыманне запоўненага і падпісанага пратаколу допінг-кантролю; - адтэрміноўка працэдуры допінг-кантролю.

Абавязкі спартоўца пад час працэдуры допінг-кантролю: - наяўнасць дакумена для ідэнтыфікацыі асобы; - выкананне гігіенічных правілаў; - допуск прадстаўніка антыдопінгавай арганізацыі ў якасці сведкі працэдуры; - дакладнасць запаўнення пратакола допінг-кантролю; - пералік медыкаментаў і харчовых дадаткаў, што ўжываліся на працягу апошніх 7 (сямі) дзён, для афармлення пратакола допінг-кантролю; - праверка дакладнасці запісаў і падпісанне пратаколу допінг-кантролю; - захаванне копіі пратаколу допінг-кантролю на працягу не менш як 6 (шасці) месяцаў.

**Тэма 6. Сусветнае антыдопінгавае агенцтва: стварэнне і падставы дзейнасці.**

Гісторыя стварэння Сусветнага антыдопінгавага агенцтва (САДА). Структура і рэгламент дзейнасці САДА. Антыдопінгавая палітыка і яе рэалізацыя. Супрацоўніцтва САДА з Міжнародным Алімпійскім камітэтам, іншымі міжнароднымі арганізацыямі, дзяржаўнымі інстытутамі і нацыянальнымі антыдопінгавымі агенцтвамі. Падставы фінансавання САДА. Перспектывы мадэрнізацыі і дзейнасці САДА.

**Тэма 7. Спіс САДА: забароненыя рэчывы ў сістэме спартыўнай дзейнасці.**

Ліст забароненых рэчываў і метадаў САДА. Субстанцыі і метады, што забароненыя як пад час правядзення спаборніцтваў, так і па-за імі. Анабалічныя агенты. Пептыдныя гармоны, фактары росту, а таксама падобныя субстанцыі і міметыкі. Бета-2-аганісты. Гармоны і мадулятары метабалізму. Дыўрэтыкі і агенты маскавання. Забароненыя метады маніпуляцыі з крывёй і яе кампанентамі. Хімічныя і фізічныя маніпуляцыі. Генны і клетачны допінг. Субстанцыі і метады забароненыя ў перыяд спаборніцтваў: стымулятары, наркотыкі, каннабіноіды, глюкакартыкоіды. Субстанцыі забароненыя ў асобных відах спорту. Бета-блакатары. Сістэма пакаранняў за ўжыванне допінгавых сродкаў і метадаў.

**Тэма 8. Міжнародныя рэгламентацыйныя дакументы ў сістэме фармавання антыдопінгавай палітыкі ў сучасным спорце.**

Сусветны антыдопінгавы кодэкс і яго характарыстыка. Фундаментальнае абгрунтаванне неабходнасці Сусветнага антыдопінгавага кодэксу. Мэты, вобласць прымянення і структура Сусветнай антыдопінгавай праграмы і кодэксу. Канвенцыя супраць прымянення допінгу ад 16 лістапада 1989 года ў Страсбургу. Дэкларацыя аб допінгу ў спорце (Лазанна, 1999). Рэзалюцыя Генеральнай канферэнцыі ААН па пытаннях адукацыі, навукі і культуры (сесія UNESCO 2005 года ў Парыжы). Міжнародная канвенцыя па барацьбе з допінгам у спорце (сесія UNESCO 2013 года ў Парыжы). Роля адукацыі ў сістэме фармавання антыдопінгавай палітыкі ў сучасным спорце. Антыдопінгавыя правілы Рэспублікі Беларусь.

**Тэма 9. Даклад Рычарда Макларэна і яго значэнне ў фармаванні антыдопінгавай палітыкі ў спорце.**

Прафесар Рычард МакЛаран (Канада) і яго даклад аб злаўжыванні допінгам у расійскім алімпійскім спорце на падставе адмыслова распрацаванай дзяржаўнай праграмы. Падрыхтоўка і змест даклада. Частка I ад 18 ліпеня 2016 года. Частка II ад 09 снежня 2016 года. Падмена пробаў допінг-кантролю на Зімовых і Летніх Алімпійскіх гульнях у перыяд з 2012 па 2014 гады. Арганізацыя, маніпуляцыя і кантроль за працэсам фальсіфікацыі з боку расійскіх дзяржаўных інстытутаў. Прызнанне з боку расійскіх афіцыйных колаў вынікаў даследаванняў САДА і МАК. Негатыўная рэакцыя міжнароднага супольніцтва на махлярствы Расіі з допінгам. Пазбаўленне РУСАДА (Расійскае антыдопінгавае агенцтва) афіцыйнай міжнароднай акрэдытацыі і адхіленне спартоўцаў Расіі ад удзелу ў Алімпійскіх гульнях.

**Тэма 10. Роля і месца фармакалогіі ў сістэме сучаснага спорту.**

Фармакалогія спорту: азначэнне, задачы, сувязь з іншымі фундаментальнымі клінічнымі і спартыўнымі дысцыплінамі. Характарыстыка фармакалагічных прэпаратаў і сродкаў, што практыкуюцца ў спартыўнай дзейнасці. Фармакалогія ў забеспячэнні падрыхтоўкі спартоўца да спаборніцтваў. Карта фармакалагічнага забеспячэння. Выкарыстанне факрмакалагічных сродкаў у адпаведнасці з этапам спартыўнай падрыхтоўкі. Параметры лімітызацыі працаздольнасці чалавека і прынцыпы іх фармакалагічнай карэкцыі. Пабудова індывідуальнай схемы фармакалагічнага забеспячэння спартыўнай дзейнасці. Адказнасць за прызначэнне лекавых сродкаў спартоўцам. Спосабы маскіроўкі забароненых прэпаратаў і рэчываў. Тэрапеўтычнае выкарыстанне забароненых прэпаратаў. Паняцце БАДаў (біялагічна актыўныя дадаткі).

## Прыкладны тэматычны план

| №№ | Назва тэмы | Форма правядзення заняткаў | | | Колькасць гадзінаў |
|---|---|---|---|---|---|
| | | **Лекцыя** | **Практычны занятак** | **СРК** | |
| 1 | Уводзіны ў праблематыку. Допінг у сучасным спорце | 2 | 2 | | 4 |
| 2 | Допінгавыя рэчывы і іх уплыў на арганізм атлетаў у выбраных відах спорту | | 2 | | 2 |
| 3 | Допінг: падставы класіфікацыі забароненых рэчываў | 2 | 2 | | 4 |
| 4 | Допінг-кантроль: методыка правядзення | | 2 | | 2 |
| 5 | Працэдура допінг-кантроля: правы і абавязкі спартоўца | | 2 | | 2 |
| 6 | Сусветнае антыдопінгавае агенцтва: стварэнне і падставы дзейнасці | | | 2 | 2 |
| 7 | Спіс САДА: забароненыя рэчывы ў сістэме спартыўнай дзейнасці | 2 | | 2 | 2 |
| 8 | Міжнародныя рэгламентацыйныя дакументы ў сістэме фармавання антыдопінгавай палітыкі ў сучасным спорце | | 2 | | 2 |
| 9 | Даклад Рычарда Макларэна і яго значэнне ў фармаванні антыдопінгавай палітыкі ў спорце | 2 | 2 | | 4 |
| 10 | Роля і месца фармакалогіі ў сістэме сучаснага спорту | 2 | | 2 | 4 |
| | **Разам** | **10** | **20** | **6** | **36** |

## Вучэбна-метадычная карта навучальнай дысцыпліны

*(спецыяльнасць "Фізічная культура і спорт",*
*дзённая форма атрымання адукацыі)*

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзінаў | | | | | Сродкі навучання (абсталяванне, вучэбна-наглядныя дапаможнікі) | Форма кантроля ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя заняткі | Семінарскія заняткі | Лабараторныя заняткі | Колькасць гадзінаў СРК | | |
| **Антыдопінгавая палітыка ў сучасным спорце** | | | | | | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 1 | Уводзіны ў праблематыку. Допінг у сучасным спорце | 2 | 2 | | | | | |
| 2 | Допінгавыя рэчывы і іх уплыў на арганізм атлетаў у выбраных відах спорту | | 2 | | | 2 | | |
| 3 | Допінг: падставы класіфікацыі забароненых рэчываў | 2 | 2 | | | | медыя прэзентацыя | вуснае апытанне |
| 4 | Допінг-кантроль: методыка правядзення | | 2 | | | | | |
| 5 | Працэдура допінг-кантроля: правы і абавязкі спартоўца | | 2 | | | | | |
| 6 | Сусветнае антыдопінгавае агенцтва: стварэнне і падставы дзейнасці | | | | | 2 | медыя прэзентацыя | |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 7 | Спіс САДА: забароненыя рэчывы ў сістэме спартыўнай дзейнасці | 2 | | | | 2 | | |
| 8 | Міжнародныя рэгламентацыйныя дакументы ў сістэме фармавання антыдопінгавай палітыкі ў сучасным спорце | | 2 | | | | | |
| 9 | Даклад Рычарда Макларэна і яго значэнне ў фармаванні антыдопінгавай палітыкі ў спорце | 2 | 2 | | | | | |
| 10 | Роля і месца фармакалогіі ў сістэме сучаснага спорту | 2 | | 2 | | | | пісьмовае апытанне |
| | **Разам: 36** | **10** | **20** | | | **6** | | **залік** |

# Вучэбна-метадычная карта навучальнай дысцыпліны

*(спецыяльнасць “Фізічная культура і спорт”, завочная форма атрымання адукацыі)*

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзінаў | | | | | Сродкі навучання (абсталяванне, вучэбна-наглядныя дапаможнікі) | Форма кантроля ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя заняткі | Семінарскія заняткі | Лабараторныя заняткі | Колькасць гадзінаў СРК | | |
| | **Антыдопінгавая палітыка ў сучасным спорце** | | | | | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 1 | Уводзіны ў праблематыку. Допінг у сучасным спорце | 2 | 2 | | | | медыя прэзентацыя | вуснае апытанне |
| 2 | Допінгавыя рэчывы і іх уплыў на арганізм атлетаў у выбраных відах спорту | | | | | | | |
| 3 | Допінг: падставы класіфікацыі забароненых рэчываў | | | | | | | |
| 4 | Допінг-кантроль: методыка правядзення | | | | | | медыя прэзентацыя | |
| 5 | Працэдура допінг-кантроля: правы і абавязкі спартоўца | | | | | | | |
| 6 | Сусветнае антыдопінгавае агенцтва: стварэнне і падставы дзейнасці | | | | | | | |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 7 | Спіс САДА: забароненыя рэчывы ў сістэме спартыўнай дзейнасці | | | | | | | |
| 8 | Міжнародныя рэгламентацыйныя дакументы ў сістэме фармавання антыдопінгавай палітыкі ў сучасным спорце | 2 | 2 | | | | | пісьмовае апытанне |
| 9 | Даклад Рычарда Макларэна і яго значэнне ў фармаванні антыдопінгавай палітыкі ў спорце | | | | | | | тэст |
| 10 | Роля і месца фармакалогіі ў сістэме сучаснага спорту | | | | | | | |
| | **Разам: 10** | **4** | **6** | | | | | **залік** |

## Асноўная літаратура

1. Всемирный антидопинговый кодекс. Международный стандарт. Запрещённый список 2019 года. Приложение 1 [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.khl.ru/upload/medicine/documents/2019_Prohibited_List_RUS.pdf. – Дата доступа: 12.11.2019.

2. Горчакова, Н. А. Фармакология спорта / Н. А. Горчакова, Я. С. Гудивок, Л.М. Гунина [и др.]; под общ. ред. С.А. Олейника, Л.М. Гуниной, Р.Д. Сейфуллы.– К.: Олимп. лит., 2010. – 639 с.

3. Гунина, Л. Анаболические агенты в спорте: механизм допингового действия и побочные эффекты / Л. Гунина // Наука в олимп. спорте. – 2015. – № 4. – С. 39–48.

4. Джусойти, А. Честная игра / А. Джусойти // Коммерсант. – 2008. – № 83. – С. 38-46.

5. Кручинский, Н. Допинг-контроль в спорте: обзор последних событий / Н. Кручинский // Наука в олимп. спорте. – 2014. – № 4. – С. 42–50.

6. Ледашин, Д. Медаль с эфедрином / Д. Ледашин, А. Харитонова, В. Хрущев// Совершенно секретно. – 2003. – № 10. – С. 30–31.

7. Макларен, Ричард Х. (McLaren Richard H.), независимое лицо. Расследование ВАДА обвинение по Сочи [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://www.wada-ama.org/sites/default/files/resources/files/20160718_ip_report_newfinal_ru_ac_1.pdf. – Дата доступа: 12.11.2019.

8. Миа, Э. Основы Олимпизма: пер. с англ. / Э. Миа, Б. Гарсиа. – М. : Рид Медиа, 2013. – 192 с.

9. НХЛ ужесточит борьбу с допингом (2009) [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.newsru.com/sport/31may2009/garri.html. – Дата доступа: 10.09.2019.

10. Обзор основных изменений с объяснениями. Запрещённый список 2019 г. [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://www.khl.ru/upload/medicine/documents/wada2019_list_ru.pdf. – Дата доступа: 12.11.2019.

11. Платонов, В. Н. Допинг в олимпийском спорте: история, состояние, перспективы / В. Н. Платонов // Допинг и эргогенные средства в спорте / под. общ. ред. В. Н. Платонова. – К.: Олимп. лит., 2003. – С. 9–49.

12. Платонов В.Н. Система подготовки спортсменов в олимпийском спорте: общая теория и ее практические приложения / В. Н. Платонов. – К.: Олимп. лит., 2004. – 808 с.

13. Платонов, В. Н. Олимпийский спорт : в 2 т. / В. Н. Платонов. – Т. 2. – К., 2009. – 696 с.

14. Платонов, В. Н. Система подготовки спортсменов в олимпийском спорте. Общая теория и ее практические приложения : учебник [для тренеров] : в 2 кн./ В. Н. Платонов. – К.: Олимп. лит., 2015. — Кн. 2. — 2015. — 752 с.

15. Скородумова, А. П. Специфика соревновательных нагрузок высококвалифицированных теннисистов / А. П. Скородумова, А. А. Кузнецов// Вест. спорт. науки. – 2013. – № 6. – С. 19–22.

16. World Anti-Doping Code / Всемирное антидопинговое агентство (ВАДА) [Электронный ресурс]. – Режим доступа:: http://мимо.com.ua/info/118-wada-world-anti-doping-agency-vsemirnoe-antidopingovoe-agentstvo-vada.html. – Дата доступа: 12.11.2019.

## *Дадатковая літаратура*


1. Backhouse, S. H. Doping in sport: a review of medical practitioners' knowledge, attitudes and beliefs / S. H. Backhouse, J. McKenna // Int J Drug Policy. – 2011 – May; 22 (3). – P. 198–202.

2. Coleman, J. E. The burden of proof in endogenous substance cases: A masking agent for junk science / J. E. Colleman, J. M. Levine // Doping and anti-doping policy in sport / ed. By M. McNamee, V. Moller. – London: Routledge, 2011. – P. 27–49.

3. Corrigan, B. Mission Statement / B. Corrigan, R. Kaslauskas. – International Olympic Committee (IOC) [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.sportsdrugs.com/aps/ss aboutus.asp. – Дата доступа: 10.09.2019.

4. Donahue, E. G. A motivational model of performance-enhancing substance use in elite athletes / E. G. Donahue, P. Miquelon, P. Valois [et al.] // J. of Sport and Exercise Psychology. – 2006. – Vol. 28. – P. 511–520.

5. Doping – Medical Commission Olympic Committee. Lausanne, 1972. – P. 33.

6. Hanstad, D. V. Elite athletes' duty to provide information on their whereabouts: justifiable antidoping work or an indefencible surveillance regime? / D. V. Hantstand, S. Loland / Europ. J. Sport Sci. – 2009. – Vol. 9 (1). – P. 3–10.

7. Harmer, P. A. (2010). Anabolic-androgenic steroid use among young male and female athletes: Is the game to blame? / P. A. Harmer // British J. of Sports Medicine. – 2010. – Vol. 44. – P. 26–31.

8. Jeffreys, I. Supplements for strength-power athletes / I. Jeffreys. – New York: Human Kinetics, 2002. – 166 p.

9. Kayser, B. Exercise starts and ends in the brain / B. Kayser // Europ. J. of Applied Physiology. – 2003. – Vol. 90. – P. 411-419.

10. Kayser, B..Current anti-doping policy: a critical appraisal / B. Kayser, A. Mauron, A. Miah // BMC Med. Ethics. – 2007. – Vol. 8. – P. 2.

11. Kenney, L. W. Physiology of Sport and Exercise / L. W. Kenney, J. H. Wilmore, D. L. Costill. – Champaign: Human Kinetics, 2012. – 621 p.

12. Kleiner, S. M. Power Eating / S. M. Kleiner. – N. Y.: Human Kinetics, 2003. – 154 p.

13. Koller, D. L. From Medals to Morality : Sportive Nationalism and the Problem of Doping in Sports / D. L. Koller // Marquette Sports Law Rev. – 2008. – Vol. 19, N. 1. – P. 92–123.

14. Lausanne Declaration on Doping in Sport [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.sportunterricht.de. – Дата доступа: 21.02.2017.

15. Lukas, J. A. Future of the Olympic Games / J. A. Lucas. – Champaign: Human Kinetics, 1992. – 231 p.

16. Maeschalck, J. Dispute resolution in high performance sport and how it influences elite athletes' careers / J. Maeschalck // Managing high performance sport / ed. by P. Sotiriadou, V. De Bosscher. – New York: Routledge, 2013. – P. 285–288.

17. Malloy, D. C. Ethics of drug testing in sport-An invasion of privacy justified? / D. C. Malloy, D. H. Zakus // Sport, Education and Society. – 2002. – Vol. 7 (2). – P. 203–218.

18. McNamee, M. J. Confidentiality, disclosure and doping in sports medicine / M. J. McName, N. C. Phillips // British J sports med. – 2011. – Vol. 45. – P. 174–177.

19. Pound, R. The Commercialization of Sport: Dilemma or Deliverance? / R. Pound// Proc. Olympic Congress of Centenary. – 1994. – P. 9–11.

20. Pound, R. Inside Olympic / R. Pound. – Toronto: Jon Willey, 2004. – 270 p.

21. Sigman, S. M. Are We All Dopes? A Behavior Law & Economics Approach to Legal Regulation of Doping in Sports / S. M. Sigman // Marquette Sports Law Rev. – 2008. – Vol. 19, N 1. – P. 126–208.

22. Smith, A. C. T. Drug policy in sport: Hidden assumptions and inherent contradictions // A. C. T. Smith, B. Stewart // Drug and Alcohol Review. – 2008. – Vol. 27. – P. 123–129.

23. The independent commission report #1 [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.wada-ama.org/sites/default/files/resources/files/wada_independent_commission_report_1_en.pdf. – Дата доступа: 12.11.2019.

24. The independent commission report #2 [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.wada-ama.org/sites/default/files/resources/files/wada_independent_commission_report_2_2016_en_rev.pdf. – Дата доступа: 12.11.2019.

**Пералік сродкаў дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці:**

- вуснае апытанне
- пісьмовае апытанне
- кантрольная работа
- тэсты
- залік

## Пытанні для самаправеркі і кантролю ведаў

1. Феномен спорту ў сацыякультурнай прасторы сучаснага глабалізаванага грамадства.

2. Класіфікацыя спорту: прафесійны спорт, камерцыйны спорт, аматарскі спорт, спорт для ўсіх.

3. Агульныя падставы фармакалагічнага забеспячэння ў спорце.

4. Паняцце і азначэнне допінгу. "Філасофія" допінгу.

5. Гісторыя ўзнікнення і прымянення допінгу.

6. Допінгавыя рэчывы і іх уплыў на арганізм атлетаў у выбраных відах спорту.

7. Характарыстыка допінгавых сродкаў і метадаў, найбольш распаўсюджаныя рэчывы, іх фізіялагічная роля і сфера прымянення.

8. Эрытрапаэцін (ЭПО, CERA): характарыстыка, фізіялагічная роля і сфера прымянення.

9. Анабалічныя стэроіды (тэстастэрон, станазалол, нандралол, матаналол): характарыстыка, фізіялагічная роля і сфера прымянення.

10. Дыўрэтыкі (хлорталідон, ацэтазаламід, трыамтарын, фурасемід): характарыстыка, фізіялагічная роля і сфера прымянення.

11. Пераліванне крыві і яе кампанентаў (гематрансфузія, аўтагематрансфузія).

12. Стымулятары псіхічнай дзейнасці (какаін, эфедрын, экстазі, амфітаміны).

13. Допінг: падставы класіфікацыі забароненых рэчываў.

14. Допінгавыя сродкі на падставе прэпаратаў наступных груп: стымулятары (стымулятары цэнтральнай нярвовай сістэмы, сімпатаміметыкі, анальгетыкі).

15. Допінгавыя сродкі на падставе прэпаратаў наступных груп: наркотыкі (наркатычныя анальгетыкі).

16. Допінгавыя сродкі на падставе прэпаратаў наступных груп: анабалічныя стэроіды, бетаблакатары, дыўрэтыкі.

17. Допінгавыя метады: крывяны допінг; фармакалагічны допінг; генны допінг.

18. Класы спалучэнняў абмежаваных з лячэбнымі мэтамі: алкаголь; марыхуана; сродкі мясцовай анэстазіі; картыкастэроіды.

19. Допінг-кантроль: методыка правядзення.

20. Паняцце і азначэнне допінг-кантролю.

21. Афіцэр допінг-кантролю: яго ідэнтыфікацыя і абавязкі.

22. Паняцце і характарыстыка сістэмы ADAMS (The Anti-Doping Administration & Management System).

23. Працэдура допінг-кантроля.

24. Антыдопінгавыя правілы і працэдурныя правілы допінг-кантроля.

25. Правы спартоўца пад час працэдуры допінг-кантролю.

26. Абавязкі спартоўца пад час працэдуры допінг-кантролю.

27. Сусветнае антыдопінгавае агенцтва: стварэнне і падставы дзейнасці.

28. Гісторыя стварэння Сусветнага антыдопінгавага агенцтва (САДА).

29. Структура і рэгламент дзейнасці САДА.

30. Антыдопінгавая палітыка і яе рэалізацыя.

31. Супрацоўніцтва САДА з Міжнародным Алімпійскім камітэтам, іншымі міжнароднымі арганізацыямі, дзяржаўнымі інстытутамі і нацыянальнымі антыдопінгавымі агенцтвамі.

32. Перспектывы мадэрнізацыі і дзейнасці САДА.

33. Спіс САДА: забароненыя рэчывы ў сістэме спартыўнай дзейнасці.

34. Ліст забароненых рэчываў і метадаў САДА.

35. Субстанцыі і метады, што забароненыя як пад час правядзення спаборніцтваў, так і па-за імі.

36. Забароненыя метады маніпуляцыі з крывёй і яе кампанентамі.

37. Хімічныя і фізічныя маніпуляцыі.

38. Генны і клетачны допінг.

39. Субстанцыі і метады забароненыя ў перыяд спаборніцтваў: стымулятары, наркотыкі, каннабіноіды, глюкакартыкоіды.

40. Субстанцыі забароненыя ў асобных відах спорту. Бета-блакатары.

41. Сістэма пакаранняў за ўжыванне допінгавых сродкаў і метадаў.

42. Міжнародныя рэгламентацыйныя дакументы ў сістэме фармавання антыдопінгавай палітыкі ў сучасным спорце.

43. Сусветны антыдопінгавы кодэкс і яго характарыстыка.

44. Фундаментальнае абгрунтаванне неабходнасці Сусветнага антыдопінгавага кодэксу.

45. Мэты, вобласць прымянення і структура Сусветнай антыдопінгавай праграмы і кодэксу.

46. Канвенцыя супраць прымянення допінгу ад 16 лістапада 1989 года ў Страсбургу.

47. Дэкларацыя аб допінгу ў спорце (Лазанна, 1999).

48. Рэзалюцыя Генеральнай канферэнцыі ААН па пытаннях адукацыі, навукі і культуры (сесія UNESCO 2005 года ў Парыжы).

49. Міжнародная канвенцыя па барацьбе з допінгам у спорце (сесія UNESCO 2013 года ў Парыжы).

50. Роля адукацыі ў сістэме фармавання антыдопінгавай палітыкі ў сучасным спорце.

51. Антыдопінгавыя правілы Рэспублікі Беларусь.

52. Даклад Рычарда Макларэна і яго значэнне ў фармаванні антыдопінгавай палітыкі ў спорце.

53. Арганізацыя, маніпуляцыя і кантроль за працэсам фальсіфікацыі з боку расійскіх дзяржаўных інстытутаў.

54. Негатыўная рэакцыя міжнароднага супольніцтва на махлярствы Расіі з допінгам на дзяржаўным узроўні.

55. Актуальныя праблемы фармавання міжнароднай антыдопінгавай палітыкі ў сучасным спорце. Пазбаўленне РУСАДА (Расійскае антыдопінгавае агенцтва) афіцыйнай міжнароднай акрэдытацыі і адхіленне спартоўцаў Расіі ад удзелу ў Алімпійскіх гульнях.

56. Роля і месца фармакалогіі ў сістэме сучаснага спорту.

57. Фармакалогія спорту: азначэнне, задачы, сувязь з іншымі фундаментальнымі клінічнымі і спартыўнымі дысцыплінамі.

58. Характарыстыка фармакалагічных прэпаратаў і сродкаў, што практыкуюцца ў спартыўнай дзейнасці.

59. Карта фармакалагічнага забеспячэння.

60. Пабудова індывідуальнай схемы фармакалагічнага забеспячэння спартыўнай дзейнасці. Адказнасць за прызначэнне лекавых сродкаў спартоўцам.

61. Тэрапеўтычнае выкарыстанне забароненых прэпаратаў.

62. Біялагічна актыўныя дадаткі: паняцце і характарыстыка.

## Пералік пытанняў для самастойнай работы

**Тэма 2. Допінгавыя рэчывы і іх уплыў на арганізм атлетаў у выбраных відах спорту.**

Мэта вывучэння тэмы: замацаваць веды пра допінгавыя рэчывы і іх уплыў на арганізм атлетаў у выбраных відах спорту.

Заданне 1. Прааналізаваць выбраныя віды спорту і ахарактарызаваць негатыўны ўплыў допінгу на арганізм атлетаў

Студэнты для аналізу самастойны выбіраюць асобныя віды спорту. На падставе атрыманай інфармацыі яны павінны вызначыць негатыўны ўплыў допінгу на арганізм атлетаў.

Форма кантролю: пісьмовае апытанне.

Апытанне праводзіцца ў перыяд адведзенага для выкладчыка кансультацыйнага часу.

**Тэма 6. Сусветнае антыдопінгавае агенцтва: стварэнне і падставы дзейнасці.**

Мэта вывучэння тэмы: замацаваць веды пра стварэнне і падставы дзейнасці Сусветнага антыдопінгавага агенцтва (WADA).

Студэнты для аналізу карыстаюцца тэкстам Антыдопінгавага кодэксу WADA. На падставе атрыманай інфармацыі яны павінны ахарактарызаваць гісторыю стварэння, структуру і рэгламент дзейнасці, супрацоўніцтва з Міжнародным Алімпійскім камітэтам, іншымі міжнароднымі арганізацыямі, дзяржаўнымі інстытутамі і нацыянальнымі антыдопінгавымі агенцтвамі, падставы фінансавання і перспектывы мадэрнізацыі і дзейнасці WADA.

Форма кантролю: пісьмовае апытанне.

Апытанне праводзіцца ў перыяд адведзенага для выкладчыка кансультацыйнага часу.

**Тэма 7. Спіс САДА: забароненыя рэчывы ў сістэме спартыўнай дзейнасці.**

Мэта вывучэння тэмы: атрымаць і замацаваць веды пра забароненыя рэчывы ў сістэме спартыўнай дзейнасці паводле спіса Сусветнага антыдопінгавага агенцтва.

Студэнты для аналізу карыстаюцца лістам забароненых рэчываў і метадаў САДА у рэдакцыі 2019 года і наступных гадоў. На падставе атрыманай інфармацыі яны павінны ахарактарызаваць забароненыя сродкі і метады допінгу адпаведна вызначаных катэгорыяў.

Форма кантролю: пісьмовае апытанне.

Апытанне праводзіцца ў перыяд адведзенага для выкладчыка кансультацыйнага часу.

## Крытэрыі ацэнкі ведаў студэнтаў

### ЗАЛІЧАНА:

- дастатковы аб'ём ведаў у рамках адукацыйнага стандарту стандарта;
- засваенне падставовай літаратуры, што рэкамендаваная вучэбнай праграмай дысцыпліны;
- выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, стылістычнае і лагічнае выказванне ў адказах на пытанне, уменне рабіць высновы без істотных памылак;
- валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, самастойнае выкананне заданняў, якія прадугледжаныя праграмай;
- уменне арыентавацца ў падставовых тэорыях, канцэпцыях і накірунках па дысцыпліне, якая вывучаецца, і даваць ім ацэнку;
- дапушчальны узровень культуры выканання заданняў.

### НЕЗАЛІЧАНА:

- недастаткова поўны аб'ём ведаў у рамках адукацыйнага стандарту;
- частковыя веды падставовай літаратуры, што рэкамендаваная вучэбнай праграмай дысцыпліны;
- выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, фармаванне адказу на пытанні з істотнымі лінгвістычнымі і лагічнымі памылкамі;
- слабое валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, некампетэнтнасць пры выкананні прадугледжаных праграмай заданняў;
- адсутнасць здольнасці арыентацыі ў падставовых тэорыях, канцэпцыях і накірунках дысцыпліны, якая вывучаецца;
- пасіўнасць на семінарскіх занятках, нізкі ўзровень культуры выканання заданняў.